У.А.СОСНА

## СЯЛЯНСТВА І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

У гістарыяграфіі склаўся стэрэатып паказу познефеадальнага сялянства Беларусі толькі як аб'екта эксплуатацыі з боку апалячаных паноў і, у меншай ступені, адміністрацыйнага самавольства расійскіх чыноўнікаў. Падрабязна распісаны ўзроўні і формы павіннасцей, паказана ў сувязі з гэтым нарастанне сацыяльнага напружання ў вёсцы, прыведзены факты сялянскіх выступленняў, якія заўжды заканчваліся непазбежнай расправай над іх удзельнікамі. Але ж жыццё вёскі мела не толькі сацыяльна-эканамічны бок. У ім, хоць і ў значна меншай ступені, прысутнічаў аспект палітычны, які нарастаў па меры размывання прыгонніцтва і набліжэння грамадства да яго ліквідацыі. Прычым разглядваемая намі эпоха ад падзелаў Рэчы Паспалітай да адмены прыгоннага права багатая на палітычныя падзеі, якія не маглі не адбівацца на лёсах вясковых жыхароў. Больш таго, пазіцыя сялян істотна ўплывала, а то і вырашала зыход войнаў, вызваленчых паўстанняў, палітычных мерапрыемстваў улад.

Ужо ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай пры ўмяшанні ў яе ўнутраныя справы расійскі царызм выкарыстоўваў і сялянскую карту. Адносіны расійскага ўрада да сялянскіх рухаў на Беларусі і Правабярэжнай Украіне былі даволі своеасаблівымі і супярэчлівымі. Афіцыйна ён асуджаў антыфеадальныя бунты і часамі нават аказваў Рэчы Паспалітай дапамогу ў іх задушэнні, але, з іншага боку, быў зацікаўлены ў існаванні царысцкіх ілюзій у масе сялян тых рэгіёнаў, якія збіраўся далучыць да сваёй дзяржавы. Відаць апошнім і можна вытлумачыць прысутнасць на каранацыі Кацярыны II і прывітальнае выступленне селяніна з Рэчы Паспалітай.

Знамянальна, што ў 1789–1790 гг. улады Рэчы Паспалітай былі вельмі занепакоеныя сялянскімі хваляваннямі, лічачы, што яны інспіруюцца расійскім урадам. Створаная з гэтай нагоды сеймавая камісія прыйшла да высновы, што з часоў Хмяльніччыны "Расія... лашчыла польскіх падданых грэчаскага веравызнання і схіляла іх да прызнання над сабою чужога ўладарання, павялічваючы ў іх непрыязнасць да іх урада"[1].

На самой справе расійскі ўрад дзейнічаў вельмі асцярожна і ў звычайных (мірных) абставінах ніколі не рашаўся на адкрытае выкарыстанне і тым больш падаграванне тых унутраных канфліктаў, якія маглі б прывесці да змены сацыяльнага ладу Рэчы Паспалітай. Ён абмяжоўваўся ўлікам нацыянальна-рэлігійнага чынніка, мяркуючы, што сама розніца ў веравызнанні землеўладальнікаў і іх падданых ва ўсходніх рэгіёнах Рэчы Паспалітай забяспечыць пры неабходнасці падтрымку ўкраінскага і беларускага сялянства. Вось што пісала Кацярына II пад час касцюшкаўскага паўстання генерал-губернатару мінскаму, ізяслаўскаму і брацлаўскаму Ц.І.Туталміну: "Чорны народ, які жыве ў абводах нашых, а больш за ўсё нам аднаверны, палякаў паноў сваіх ненавідзіць, што самой справай даказана многімі дасюль здарэннямі; а таму няцяжка будзе мець той у сваю карысць, падахвочваючы заступніцтвам ад аднаверных яму"[2]. Нельга сцвярджаць, што такая палітыка не мела пэўнага поспеху, асабліва ў праваслаўнай вёсцы Украіны і Беларусі, аднак поўная глухата і нават варожасць у адносінах да сацыяльных інтарэсаў сялянства звужалі яе плён.

У сваю чаргу няздольнасць шляхецка-буржуазных колаў рашуча адмяніць прыгонніцтва прывяла да таго, што сялянства ў асноўнай масе засталося абыякавым да падзелу Рэчы Паспалітай і адказала маўчаннем на заклік узнімацца на барацьбу з царскімі войскамі.

У сакавіку 1794 г. патрыятычныя колы шляхты і гараджан на чале з ураджэнцам Беларусі Тадэвушам Касцюшкам узнялі паўстанне, каб адстаяць незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць Рэчы Паспалітай. Быў створаны паўстанцкі ўрад Літвы і Беларусі – Найвышэйшая Літоўская Рада на чале з інжынер-палкоўнікам Якубам Ясінскім, які спрабаваў праводзіць самастой-

ную палітыку. Лёс паўстання залежаў ад пазіцыі асноўнай масы насельніцтва – сялян, якія спадзяваліся на ліквідацыю прыгоннага права і перадачу ім зямлі, што ў сапраўднасці не адбылося. Выдадзены Касцюшкам 7 мая Паланецкі універсал абяцаў сялянам асабістае вызваленне і некаторае змяншэнне феадальных павіннасцей. Аднак стараннямі памешчыкаў універсал застаўся на паперы і фактычна не дайшоў да сялян. Літоўская Рада абмежавалася агульным і няпэўным абяцаннем "вольнасці". Даволі радыкальна настроеныя ў адносінах да сялянскага пытання Касцюшка і асабліва Ясінскі былі вымушаны ў сваіх дзеяннях улічваць і інтарэсы шляхты, каб не адштурхнуць яе ад паўстання. Царскія ж генералы давалі сялянам розныя дэмагагічныя абяцанні і настройвалі іх супраць паўстанцкай шляхты. Усё гэта абумовіла абмежаваны ўдзел сялян у паўстанні 1794 г. і нейтральна-пасіўную пазіцыю іх асноўнай масы[3].

У дзейнасці тайных гурткоў і таварыстваў 10–20-х гг. XIX ст. можна адзначыць факты спачування сялянам, цікавасці да іх жыцця, прапановы аб паляпшэнні стану, але гэтыя першыя рэвалюцыянеры не лічылі сялянства рэальнай сілай і не імкнуліся абаперціся на яго. Такія адносіны да асноўнай масы насельніцтва прадвызначылі паражэнне шляхецкага паўстання 1830–1830 гг., кансерватыўная праграма якога не знайшла масавай падтрымкі на Беларусі. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся ў атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўлены ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем. Але вядомы і выпадкі добраахвотнага ўдзелу сялян у паўстанні, заклікаў да непадпарадкавання расійскім уладам[4].

Са свайго боку, ўлады баяліся распаўсюджвання ў сялянстве пагалосак аб паўстанні. Мясцовай адміністрацыі прадпісвалася выяўляць і арыштоўваць "падбухторшчыкаў" сялян і шляхецкіх агітатараў, прадухіляць народныя сходы ў корчмах. У сваёй уласнай прапагандзе, прызначанай беларусам і ўкраінцам, царызм стаў выкарыстоўваць сацыяльныя і асабліва нацыянальна-рэлігійныя супярэчнасці паміж сялянамі-праваслаўнымі і уніятамі і шляхціцамі-каталікамі. Антыпаўстанцкую агітацыю сярод насельніцтва абавязвалася весці царква, асабліва праваслаўная. Робячы стаўку на ізаляцыю шляхецкага руху ад сялян, урад прадугледжваў дыферэнцыраваныя пакаранні тым з іх, якія аказаліся ўцягнутымі ў паўстанне. Згодна указу Мікалая І Сенату ад 22 сакавіка 1831 г., такім сялянам абяцалася дараванне, калі яны добраахвотна складуць зброю і вярнуцца дадому. Тых жа "людзей ніжэйшага звання", якія будуць узяты са зброяй у руках, прадпісвалася аддаваць у рэкруты і адпраўляць на службу ў сібірскія лінейныя батальёны[5]. У жніўні 1831 г. адміністрацыя і вайсковыя ўлады заходніх губерняў атрымалі указ аб захадах па абароне сялян ад помсты сваіх уладальнікаў за няўдзел у паўстанні, але пры гэтым яны павінны былі наглядаць,"каб тыя не маглі стацца для сялян падставай да непадпарадкавання законнай уладзе іх памешчыкаў і адміністратараў"[6]. У галоўным, жыццёвым для сялян пытанні рэфармавання прыгонніцкіх адносін царызм тады далей дэмагагічных абяцанняў вызваліць іх ад улады "польскіх памешчыкаў" не пайшоў.

Шляхецкія рэвалюцыянеры ўлічылі ўрокі паўстання. Іх рух, асабліва ў 40-я гады, дэмакратызаваўся і радыкалізаваўся, набываў антыпрыгонніцкі характар. У ім удзельнічала ўсё больш прадстаўнікоў разначыннай інтэлігенцыі, якая імкнулася павесці за сабой сялянскія масы. Хоць розніца сацыяльных інтарэсаў шляхецкага і сялянскага саслоўяў, узмоцненая на Беларусі яшчэ і нацыянальна-рэлігійнай варожасцю, рабіла праблематычным саюз паміж імі, тым не менш па меры дэмакратызацыі шляхецкага руху, адыходу ад яго арыстакратычных пластоў, узрастала магчымасць якасна новага, антыфеадальнага саюзу рэвалюцыйнай дэмакратыі і сялянства. Ідэі правадыра польскай дэмакратыі Іаахіма Лялевеля, які ўжо ў 1830 г. настойваў праз вызваленне сялян далучыць масы насельніцтва да рэвалюцыі, знаходзілі шмат паслядоўнікаў. Паводле звестак ІІІ Аддзялення імператарскай канцылярыі, у Парыжы тады склалася "таварыства палякаў, мэта якога заключалась ў распаўсюджванні камунізма між ніжэйшага класа плямёнаў славянскіх"[7].

Шляхецкая паўстанцкая эміграцыя, што асела пераважна ў Францыі, першапачаткова не губляла надзей на ўзнаўленне ваенных дзеянняў і засылала на беларусь сваіх эмісараў. Сярод іх быў ураджэнец Слонімшчыны Міхал Валовіч, які ў сакавіку 1833 г. тайна вярнуўся на радзіму, сфарміраваў у асноўным з сялян уласнай вёскі невялікі атрад і ажыццяўляў партызанскія дзеянні ў Слонімска-Навагрудскай акрузе. Мэтай сваёй барацьбы ён лічыў вызваленне сялян і абвяшчэнне Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай. Аднак ужо ў маі "экспедыцыя Валовіча" была ліквідавана.

Студэнт Медыка-хірургічнай акадэміі ўраджэнец Піншчыны Франц Савіч заснаваў у 1836 г. у Вільні "Дэмакратычнае таварыства", члены якога прапагандавалі ідэі дружбы народаў, заклікалі да барацьбы супраць самадзяржаўя, патрабавалі вызвалення сялян і надзялення іх зямлёй; праз тры гады яны былі арыштаваны. У 1846–1849 гг. у Вільні, Мінску, Гродне, Лідзе, Ашмянах і іншых гарадах існавала тайная арганізацыя "Саюз свабодных братоў", якая налічвала каля 200 членаў. Вялася прапаганда сярод салдат і афіцэраў мінскага гарнізона, выраблялася зброя, завязваліся непасрэдныя кантакты з сялянамі аж да ўцягнення іх ў арганізацыю[8].

У беларускай і польскамоўнай "краёвай" літаратуры з'яўляюцца антыцарскія агітацыйныя творы, праводзіцца ідэя аб'яднання сялянства з перадавой шляхтай дзеля паляпшэння яго долі. Характэрны ў гэтым плане напісаны пад уплывам рэвалюцыйных падзей 1848 г. у Еўропе верш Уладзіслава Сыракомлі "Добрыя весці". У гэтым дайшоўшым да нас у некалькіх спісках амаль адзіным вядомым беларускамоўным творы знакамітага мясцовага літаратара паведамлялася, як на Захадзе "б'юцца для славы, свабоды і чэсці і робяць вольных людзей з мужыкоў", і выказвалася надзея, што "мужык і шляхціц засядзе на лаве, каб весці раду аб сваёй зямлі"[9].

Сапраўдную моц уздзеяння на насельніцтва антыпрыгонніцкай і антыцарскай агітацыі ўлады адчулі пры ўціхамірванні ў 40-я гады хваляванняў сялян у казённым маёнтку Смаргонь Віленскай губерні. Смаргонскія сяляне былі незадаволены злоўжываннямі дзяржаўнай адміністрацыі. Размах і ўпарты характар іх барацьбы вымушалі ўлады часта ўводзіць воінскія каманды і ажыццяўляць у маёнтку экзекуцыі. Сюды выязджалі вышэйшыя чыны губернскай адміністрацыі і Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У красавіку 1847 г. у маёнтку быў распаўсюджаны ліст з заклікам да сялян сумесна з мяшчанамі і ніжэйшымі чынамі знішчаць афіцэраў раскватараваных воінскіх часцей, выразаць усіх памешчыкаў і ўпраўляючых, як зрабілі сяляне Галіцыі ў 1846 г., каб здабыць сабе свабоду[10]. Пад уплывам падзей у Смаргоні адбыўся шэраг хваляванняў дзяржаўных і памешчыцкіх сялян на Віленшчыне. Губернскія ўлады прыбеглі да надзвычайных мер, каб справіцца з сітуацыяй. Аўтарам "возмутительного воззвания" аказаўся дробны чыноўнік, шляхціц Юльян Бакшанскі, які лічыў, "што ўсю амаль сілу народа складае клас, званы сялянамі"[11]. Як паказала следства, ён адначасова пасылаў лісты ў некалькі паветаў, збіраўся даць смаргонскім сялянам значную суму грошай для набыцця зброі і пашырыць сялянскі рух аж да Вільні, каб напасці на губернатара і генерал-губернатара[12].

Хоць такога роду з'явы ў сялянскім руху Беларусі былі яшчэ адзінкавымі, але яны надзвычай устрывожылі царскі ўрад. "Вельмі трэба асцерагацца, – папярэджваў у 1831 г. міністр фінансаў Я.Ф.Канкрын, – каб з польскага бунту не зрабіўся б сялянскі"[13]. Для ізаляцыі шляхецкага руху ад сялянскіх мас і ўмацавання на гэтай аснове сваіх сацыяльных і палітычных пазіцый урад пайшоў на правядзенне ў беларускай вёсцы шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на змякчэнне феадальнага прыгнёту (люстрацыя дзяржаўных маёнткаў, інвентарная рэформа) і пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы (скасаванне уніі), дэмагагічна выстаўляючы сябе абаронцам сялянства. Вынікі барацьбы шляхецкіх дэмакратычных колаў з расійскім самадзяржаўем за душы беларускіх сялян яскрава праявіліся ў паўстанні 1863 г.[14]

Такім чынам, калі ў грамадска-палітычным руху да 30-х гг. XIX ст. сялян імкнуліся зрабіць толькі слугамі паўстанняў, то пасля быў узяты кірунак на

тое, каб яны сталі поруч з іншымі саслоўямі іх раўнапраўнымі гаспадарамі. У сувязі з гэтым беларускі мужык вымусіў лічыцца з сабою і царскія ўлады, якія пераходзілі ад нічога не абавязваючых заляцанняў з ім у часы абвастрэння палітычнай сітуацыі да некаторых уступак яму ў аграрнай сферы. Выпадкі ж усё больш усведомленых паводзін сялянства сведчылі, што яно з пасіўнага аб'екта палітычных маніпуляцый пачынала станавіцца суб'ектам грамадска-палітычнага жыцця.

[1] Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў у Маскве. Ф. ВУА, спр. 271, арк. 3 адв.

[2] Русский архив. 1873. Кн 2. Стлб. 2289.

[3] Гл.: Емяльянчык У. Паланез для касінераў (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі). Мн.,1994.

[4] Гл.: Русак О.В. Отношение крестьянства Белоруссии к востанию 1830–1831 гг. // Сельское хозяйство и крестьянство Беларуси (Материалы научной конференции. 27–29 октября 1989 г. г. Гомель). Мн., 1991.

[5] Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т.4. С.88–89.

[6] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Кіеве. Ф. 533, воп. 4, спр. 168, арк. 27 адв.

[7] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ў Маскве (далей ДАРФ). Ф. 109, воп. 223, спр.11, арк.109.

[8] Гл.: Смирнов А.Ф. Революционные связи народов России и Польши. 30–60 годы XIX в. М., 1962. С. 58–143.

[9] Сыракомля У. Добрыя весці: Паэзія, проза, крытыка. Мн., 1993. С.15.

[10] Чепко В.В. Общественно-политическое движение в Белоруссии в 40-е гг. XIX в. // Труды Института истории АН БССР. Мн., 1958. Вып. 3. С. 123–124.

[11] ДАРФ. Ф. 109, I эксп., 1847 г., спр. 114, арк. 4.

[12] Конюхова Т.А. Крестьянское движение в государственной деревне Виленской и Ковенской губерний в период реформы П.Д. Киселева // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1966 г. Таллин, 1971. С.415 і інш.

[13] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т.2. С.336.

[14] Гл.: Байкова С.М. К вопросу об участии крестьян Белоруссии в восстании 1863 г. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1961 г. Рига, 1963.

*С. Ф. ШИМУКОВИЧ*

## ТРУДОВАЯ ПОМОЩЬ КАК ВИД БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ НА БЕЛАРУСИ (конец XIX – начало XX в.)

Одной из актуальных проблем белорусской историографии в современных условиях является благотворительная деятельность. Истоки ее восходят к концу XIX в., когда Беларусь входила в состав Российской империи. Тогда были сделаны попытки разработать классификацию всех благотворительных учреждений империи. Необходимость в классификации возникла в связи с определением и регламентацией деятельности Хозяйственного департамента (с 1900 г. – Департамент общих дел) Министерства внутренних дел, которое непосредственно направляло работу многих благотворительных организаций[1]. На основе проведенной классификации были выделены следующие благотворительные учреждения: общества общего характера деятельности; общества, оказывающие помощь взрослым и детям. Государственные ведомства были особенно заинтересованы в организации именно трудовой помощи со стороны благотворительных учреждений, считая их способными эффективно бороться с распространением нищенства. В официальных изданиях отмечалось, что хотя «трудовая помощь не может быть панацеей в борьбе с нищенством, но это одно из действенных средств борьбы для его сокращения»[2].

Осознание трудовой помощи как наиболее рационального вида благотворительной деятельности в Российской империи произошло позже, чем в странах Европы. С основанием в 1895 г. Попечительства о Домах трудолюбия и Работных домах, которое стало издавать специализированный журнал «Трудовая помощь», внимание российской общественности к проблемам благотворительности стало возрастать. Одновременно началась рабо-